# § 25. Знешняя палітыка Вялікага Княства Літоўскага

КРЭЎСКАЯ УНІЯ
ТЭЎТОНСКІ ОРДЭН ВІТАЎТ
МАСКОЎСКАЕ ВЯЛІКАЕ КНЯСТВА
«ВЯЛІКАЯ ВАЙНА» ЗАЛАТАЯ АРДА
ОРДЭН МЕЧАНОСЦАЎ ЯГАЙЛА
ГРУНВАЛЬДСКАЯ БІТВА

Прыход да ўлады Ягайлы

**1. Крэўская унія і яе наступствы.** Колькасная перавага ўсходнеславянскага насельніцтва ў ВКЛ, палітычны і сацыяльна-эканамічны патэнцыял беларускіх і ўкраінскіх зямель, іх культурна-рэлігійны ўплыў вызначылі палітыку вялікіх князёў літоўскіх. Гэтыя фактары спрыялі паступовай хрысціянізацыі літоўскай знаці паводле праваслаўнага абраду. Але неўзабаве пасля прыходу да ўлады Ягайлы палітыка ВКЛ кардынальна змянілася: краіна пачала арыентавацца на заходні кірунак.

Вялікі князь у атачэнні ворагаў

У ходзе дынастычнай барацьбы абвастрыліся адносіны Ягайлы адразу з двума сур'ёзнымі сапернікамі — Маскоўскім вялікім княствам і Тэўтонскім ордэнам. Ягайла меў магчымасць вырашыць спрэчныя пытанні і зблізіцца з Масквой шляхам шлюбнай дыпламатыі, аднак тут яго напаткала няўдача. Невядома, што мацней ускладняла іх адносіны: ці то падтрымка Маскоўскім вялікім княствам Андрэя Полацкага, які прэтэндаваў на ўладу, ці то досыць актыўнае супрацоўніцтва Ягайлы з Залатой Ардой, у тым ліку падчас падрыхтоўкі да Кулікоўскай бітвы. Няпроста складваліся адносіны і з тэўтонамі. Раней яны былі саюзнікамі Ягайлы, але пачалі выкарыстоўваць унутрыдынастычныя сваркі ў ВКЛ

дзеля дасягнення ўласных мэт і заключылі тайныя дамоўленасці з Кейстутам і Вітаўтам, якія прэтэндавалі на трон.

**Паварот у бок Польшчы**

Улічыўшы сваё хісткае становішча, Ягайла быў вымушаны шукаць новых саюзнікаў. Свой погляд вялікі князь звярнуў у бок Польшчы, дзе дынастычнае становішча складвалася для яго больш чым спрыяльна. Пасля смерці караля Польшча сутыкнулася з сур’ёзнай пагрозай узмацнення германізацыі. Неабходнасць супрацьстаяць экспансіі нямецкіх крыжакоў стала падставай для збліжэння Польшчы і ВКЛ. Шляхам зліцця польская знаць разлічвала вырашыць на сваю карысць спрэчныя пытанні аб прыналежнасці Валыні і Падолля, а ў стратэгічным плане — падпарадкаваць усё княства. У сваю чаргу, жаніцьба Ягайлы з каралевай Ядвігай давала яму магчымасць знайсці пункт апоры ў вырашэнні ўнутрыпалітычных супярэчнасцей і, ахвяраваўшы суверэнітэтам уласнай краіны, атрымаць польскую карону.

- смерць польскага караля Людовіка I Анжуйскага;
- няма нашчадкаў па мужчынскай лініі;
- 11-гадовая дачка Ядвіга каранавана на прастол (афіцыйны тытул — кароль);
- пошук вартага сужэнца для Ядвігі



*Польшча*

ДЫНАСТЫЧНЫ КРЫЗІС

ПРАБЛЕМА З УСПАДКАВАННЕМ ПРАСТОЛА

ДЫНАСТЫЧНАЯ БАРАЦЬБА

*ВКЛ*



- полацкі князь Андрэй (старэйшы брат);
- Кейстут і Вітаўт (дзядзька і стрыечны брат)

Зрабіце вывад пра тое, што спрыяла заключэнню Крэўскай уніі.

**14 жніўня 1385 г.** у Крэўскім замку (Смаргонскі раён Гродзенскай вобласці) адбылася сустрэча Ягайлы з польскім пасольствам, на якой былі дасягнуты дамоўленасці, што атрымалі назву *Крэўскай уніі*. Канчаткова акт дадзенага саюзу быў зацверджаны праз паўгода: Ягайла, як і абяцаў, быў хрышчаны ў каталіцтва, у сталіцы Польшчы Кракаве адбыўся каралеўскі абрад вянчання з Ядвігай, а пасля і каранацыя пад імем Уладзіслава II.

## АСНОЎНЫЯ ПАЛАЖЭННІ КРЭЎСКАЙ УНІІ



1. Ягайла праз шлюб з Ядвігай робіцца польскім каралём
2. ВКЛ далучаецца да Каралеўства Польскага
3. Казна ВКЛ пераводзіцца ў Кракаў
4. Ягайла пераходзіць у каталіцтва і абавязуецца хрысціянізаваць літоўцаў-паганцаў паводле каталіцкага абраду

### Вынікі Крэўскай уніі

Крэўская унія на некалькі стагоддзяў змяніла знешнепалітычны вектар ВКЛ, накіраваўшы яго на палітычнае, эканамічнае і культурнае збліжэнне з Польшчай і іншымі каталіцкімі краінамі Еўропы. Пачалося перамяшчэнне ВКЛ з арэалу пашырэння руска-візантыйскіх культурных традыцый у бок заходняга «лацінскага» свету. Пашырэнне каталіцтва выклікала незадавальненне праваслаўнага насельніцтва, абвастрыла ўнутраныя супярэчнасці ў краіне. Аднак асноўнае палажэнне Крэўскай уніі — далучэнне ВКЛ да Польшчы — рэалізавана не было. Дзяржава здолела захаваць сваю незалежнасць,

а значыць, і магчымасць правядзення ўласнай знешняй і ўнутранай палітыкі.

**2. Барацьба супраць крыжакоў.** Крыжовыя паходы пакінулі значны след у гісторыі многіх еўрапейскіх і азіяцкіх народаў і краін. Першапачаткова экспансія крыжакоў была накіравана на мусульман Блізкага Усходу, але ў другой палове XII ст. вектар іх агрэсіі перамясціўся на Паўночную і Усходнюю Еўропу, дзе жылі язычнікі славянскага, балцкага і фіна-ўгорскага паходжання.

Пачатак нямецкай экспансіі

Яшчэ ў пачатку XIII ст. полацкія князі супрацьстаялі ордэну мечаносцаў. Таксама смела змагаліся з «ваярамі крыжа» літоўцы, якім у 1236 г. удалося нанесці цяжкае паражэнне ворагу пры Саўле. У 1242 г. ноўгарадскі князь Аляксандр Неўскі атрымаў легендарную перамогу на Чудскім возеры. Аднак гэтыя поспехі не змянілі карэнным чынам сітуацыю ў рэгіёне. У канцы XIII ст. крыжакі страцілі ўсе свае заваёвы ў Палесціне, пасля чаго галоўнымі аб’ектамі іх экспансіі сталі ВКЛ і Польшча, што межавалі з Тэўтонскім ордэнам.

Беларускія гарады пад націскам крыжакоў

У 1284 г. крыжакі атакавалі Гародню, якая ў далейшым разам са ўсім Панямоннем амаль штогадова зазнавала іх напады. У 1314 г. тэўтонская армія паспрабавала ўзяць Навагародак, і толькі паспяховыя дзеянні старасты Давыда Гарадзенскага перашкодзілі тэўтонскім рыцарам захапіць сталіцу ВКЛ.

Агульная знешняя небяспека спрыяла збліжэнню ВКЛ і Польшчы. У 1326 г. адбыўся першы сумесны ваенны паход ВКЛ і Польскага Каралеўства супраць усходнегерманскага маркграфства Брандэнбург, які завяршыўся перамогай. Аднак пазней Польшча заключыла мір з Тэўтонскім ордэнам, пасля чаго той скіраваў усе свае сілы супраць ВКЛ. У **1348 г.** вялікая армія крыжакоў, у склад якой уваходзілі нямецкія, англійскія і французскія рыцары, уварвалася ў ВКЛ і нанесла значны ўрон

войску Альгерда ў бітве на рацэ *Стрэве*. У другой палове XIV ст. ціск з боку крыжакоў узмацніўся. Яны ладзілі штогадовыя рэйды, якія суправаджаліся маштабнымі разбурэннямі і вывазам людзей. У беларускім Падзвінні цэнтрам абароны зрабіўся Полацк, князь якога Андрэй Альгердавіч паспяхова ваяваў супраць крыжакоў, здзяйсняў вылазкі да галоўнай цвярдыні нямецкіх рыцараў — горада-крэпасці Дынабурга (Даўгаўпілс, Латвійская Рэспубліка).

На шляху да «Вялікай вайны»

Падчас дынастычнай барацьбы Ягайлы з яго канкурэнтамі за ўладу ВКЛ страціла Жамойць, што пакінула краіну без выхаду да Балтыйскага мора і дазволіла крыжакам аб'яднаць свае прускія і лівонскія ўладанні. Аднак заключэнне Крэўскай уніі змяніла баланс сіл. Польшча зрабілася саюзніцай ВКЛ і была вымушана вярнуцца да барацьбы супраць крыжацкіх дзяржаў.

У 1408 г. Вітаўт сустрэўся з Ягайлам у Навагародку, дзе было прынята рашэнне пачаць вайну супраць Тэўтонскага ордэна. У канцы лета 1409 г. крыжакі ўварваліся ў Польшчу, а войскі ВКЛ занялі Жамойць. Пачалася крывавая вайна *1409–1411 гг.*, якая ўвайшла ў гісторыю як *«Вялікая»*. Цэнтральнай яе падзеяй стала Грунвальдская бітва.

Суадносіны сіл

**3. Грунвальдская бітва і яе значэнне.** Грунвальдская бітва, якая адбылася **15 ліпеня 1410 г.**, была адной з найбуйнейшых бітваў XV ст. і адыграла значную ролю ў міжнародным жыцці сярэдневяковай Еўропы. У ёй з абодвух бакоў узяло ўдзел ад 45 да 60 тыс. чалавек. Апроч немцаў у армію крыжакоў уваходзілі рыцары з Францыі, Англіі, Чэхіі і іншых заходніх краін. Аснову саюзнага войска ВКЛ і Польшчы склалі 40 харугваў з Полацкай, Віцебскай, Смаленскай, Пінскай, Берасцейскай, Навагародскай, Пінскай і іншых зямель ВКЛ і 51 польская харугва. На баку ВКЛ і Польшчы ваявалі таксама татары і чэхі.

Падчас бітвы поспех спадарожнічаў то аднаму боку, то другому. Асаблівы гераізм выявілі ваяры смаленскай харугвы, якія коштам жыцця не дазволілі крыжакам ударыць з фланга. У выніку крывавага бою аб'яднаныя войскі ВКЛ і Польшчы акружылі і знішчылі сілы Тэўтонскага ордэна, страты якога ацэньваюцца ў 8 тыс. чалавек.

**Разгром Тэўтонскага ордэна**

Паражэнне крыжакоў каля Грунвальда дало саюзным войскам магчымасць прасунуцца ўглыб зямель Тэўтонскага ордэна і аблажыць яго сталіцу Мальбарк. Аднак захапіць горад не атрымалася. 1 лютага 1411 г. у *Торуні* была заключана мірная дамова, згодна з якой Жамойць і яцвяжскія землі на час жыцця Вітаўта прызнаваліся за ВКЛ, Польшча вяртала сабе асобныя памежныя тэрыторыі, а Ордэн абавязваўся выплаціць пераможцам велізарную суму грошай.

## ПРАЦУЕМ З ГІСТАРЫЧНАЙ КРЫНІЦАЙ

**З «Хронікі Быхаўца» (XVI ст.)**

«Рушыў з войскам літоўскім на немцаў, і дашчэнту іх разбілі; і самога магістра і комтураў ягоных да смерці забілі і незлічонае мноства немцаў паланілі ды пабілі… Немцаў разбіўшы, шмат гарадоў ды зямель іхніх пабраўшы, а астатнія дашчэнту зруйнаваўшы ды выпаліўшы і ўсю зямлю спустошыўшы, з вялікаю пашанаю і з нечуванай перамогай, на ўвесь свет выдатную славу здабыўшы, у свае землі вярнуліся».

*Каму сімпатызуе аўтар «Хронікі»? Якія элементы тэксту «Хронікі» дазваляюць зрабіць такі вывад?*

**Хроніка Яна Длугаша (другая палова XV ст.)**

*«Перад Грунвальдскаю бітвай абодва бакі доўгі час стаялі нерашуча, не жадаючы ўступіць у бітву. Каб раззлаваць Ягайлу і Вітаўта і справакаваць іх наступ у нявыгаднай мясцовасці, магістр крыжакоў даслаў ім два мячы, заявіўшы, што калі яны не маюць зброі, дык крыжакі пасылаюць яе ім, каб тыя маглі нарэшце наважыцца на бой. Ягайла і Вітаўт прынялі „дарунак“ і, хоць намагаліся ніяк не паказаць свайго абурэння, неўзабаве пачалі атаку».*

*1. Які тытул насіў чалавек, што ўзначальваў войска Тэўтонскага ордэна?*
*2. З якой мэтай крыжакі даслалі «дарункі» Ягайлу і Вітаўту?*

Гістарычнае значэнне Грунвальда

Перамога пад Грунвальдам мела важнае стратэгічнае значэнне. Яна падарвала не толькі ваеннае, але і эканамічнае становішча Тэўтонскага ордэна. Нягледзячы на тое што дзяржавы крыжакоў засталіся на карце Еўропы, яны ўжо не маглі праводзіць ранейшую агрэсіўную знешнюю палітыку. У далейшым крыжакі канчаткова адмовяцца ад прэтэнзій на Жамойць, а Тэўтонскі ордэн і ўвогуле зробіцца васалам Польшчы.



*Грунвальдская бітва. Мастак Я. Мацейка. 1878 г.*

Якія дзве гістарычныя асобы выяўлены ў цэнтральнай частцы карціны? Як мастак паказвае трыумф адной і паражэнне другой?

Супрацьстаянне ў справе «збірання рускіх зямель»

**4. Прычыны сутыкнення інтарэсаў Вялікага Княства Літоўскага і Маскоўскага вялікага княства.** Напрыканцы XIV ст. ВКЛ ужо належалі значныя тэрыторыі Усходняй Еўропы, што раней уваходзілі ў склад Старажытнай Русі. Імклівы рост і ўзмацненне ВКЛ выклікалі незадаволенасць Маскоўскага вялікага княства: яго кіраўнікі лічылі сябе пераемнікамі кіеўскіх

князёў і разглядалі пашырэнне ВКЛ як замах на іх спадчыну.

**Лідарства ВКЛ**

Адносіны паміж дзвюма дзяржавамі абвастрыліся ў другой палове XIV ст., у праўленне Альгерда і Дзмітрыя Данскога. У 1368–1372 гг. Вялікае Княства Літоўскае ўпершыню сутыкнулася з Маскоўскім княствам, якое таксама разлічвала на далучэнне зямель, што раней належалі Старажытнай Русі. Спрэчкі перараслі ва ўзброеныя сутыкненні, якія завяршыліся падзелам зямель былой Старажытнай Русі на сферы ўплыву Вільні і Масквы.

Вітаўт, прыйшоўшы да ўлады, учыніў новую спробу падпарадкаваць сабе ўсе землі Старажытнай Русі. Дзякуючы яго намаганням да ВКЛ былі далучаны Смаленскае і іншыя княствы, але ў далейшым пра аб'яднанне ўсіх рускіх зямель у складзе ВКЛ гаворка ўжо не ішла. У сярэдзіне XV ст. у абедзвюх краінах — прэтэндэнтах на спадчыну Старажытнай Русі ўзніклі ўнутрыдзяржаўныя супярэчнасці, звязаныя з барацьбой за прастол розных кандыдатаў, што часова паменшыла знешняе супрацьстаянне. Больш за тое, вялікі князь літоўскі Казімір і вялікі князь маскоўскі Васіль II падпісалі дамову, якая размежавала сферы ўплыву абедзвюх дзяржаў.

**Пераход ініцыятывы да Масквы**

Аднак у апошняй трэціне XV ст. адносіны паміж краінамі зноў абвастрыліся, бо Іван III аднавіў актыўную палітыку аб'яднання рускіх княстваў вакол Масквы. Пасля падпарадкавання Растоўскай, Ноўгарадскай, Цвярской, Вяцкай зямель, усталявання кантролю над Псковам і Разанню па-за ўплывам Маскоўскага вялікага княства заставаліся толькі землі былой Старажытнай Русі, якія ўваходзілі ў склад Вялікага Княства Літоўскага. Шэраг войнаў, што доўжыліся з 1492 да 1537 г., наглядна прадэманстраваў пераход ініцыятывы ў справе «збірання рускіх зямель» у рукі Масквы. Нягледзячы на пэўныя ваенныя поспехі ВКЛ на полі бітвы і дыпламатычнай ніве, вынікам пяці войнаў было ўмацаванне пазіцый

Маскоўскага вялікага княства і ператварэнне яго ў Расійскую дзяржаву. У другой палове XVI ст. узаемаадносіны паміж ВКЛ і Расіяй выліліся ў адкрытае супрацьстаянне ў перыяд Лівонскай вайны.




*Вялікае Княства Літоўскае ў XIV–XV стст.*

Знайдзіце на картасхеме, якія ўсходнеславянскія землі былі далучаны да ВКЛ у праўленне Вітаўта.

*Найважнейшаю падзеяй знешнепалітычнага жыцця ВКЛ у XIV–XV стст. было заключэнне Крэўскай уніі, якая аказала велізарны ўплыў на ўсе галіны жыцця грамадства. На заходнім напрамку галоўным пытаннем з'яўлялася барацьба з нямецкімі крыжакамі, у якой ВКЛ у саюзе з Польшчай дасягнула пераканаўчых поспехаў, разграміўшы агрэсіўны Тэўтонскі ордэн. На ўсходнім напрамку ў справе «збірання рускіх зямель» ішло адкрытае супрацьстаянне з Масквой, у якім, нягледзячы на поспехі першай паловы XV ст., ВКЛ усё ж выпусціла ініцыятыву.*

| калі ў свеце… | на тэрыторыі Беларусі… |
|---|---|
| 1453 г. — захоп туркамі-асманамі Канстанцінопаля | 1410 г. — Грунвальдская бітва, якая мела вырашальнае значэнне для перамогі над Тэўтонскім ордэнам |

**ПЫТАННІ І ЗАДАННІ**

1. Пералічыце ўнутры- і знешнепалітычныя прычыны, якія падштурхнулі Ягайлу да заключэння уніі з Польшчай.
2. Якія, на ваш погляд, станоўчыя і адмоўныя наступствы заключэння Крэўскай уніі? Сваю думку абгрунтуйце.
3. Вызначце асноўныя напрамкі знешняй палітыкі ВКЛ у XIV–XV стст. Ахарактарызуйце кожны з іх.
4. Уявіце, што вы павінны выступіць на школьнай канферэнцыі па тэме «Грунвальдская бітва — вырашальная падзея „Вялікай вайны“». Падрыхтуйце кароткую інфармацыю пра дадзеную падзею, падбярыце ілюстрацыйны матэрыял (карты мясцовасці, партрэты ключавых фігур, выявы зброі і даспехаў таго часу, сцэны бітвы). Прэзентуйце сваю працу аднакласнікам. Ваша выступленне павінна быць яскравым, інфарматыўным і суправаджацца дэманстрацыяй падрыхтаваных матэрыялаў.